Журнал Белорусского государственного университета. История. 2021;1:26–35
Journal of the Belarusian State University. History. 2021;1:26–35

УДК 338(476)(091)«18/19»(043.3)

# ОСНОВНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ ДЕЛОВОЙ АКТИВНОСТИ В БЕЛАРУСИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в. (НА ПРИМЕРЕ г. МИНСКА)

***А. В. БУРАЧОНОК***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет,
пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

На основе материалов делопроизводства, статистических и законодательных источников Российской империи исследуется развитие основных направлений деловой активности в Минске в конце XIX – начале XX в. В динамике показаны количественные и качественные изменения, произошедшие в сферах промышленности и торговли. Отображено состояние кредитного дела. Выявлены институциональные изменения в экономической жизни Минска в пореформенный период. В выводах рассмотрено влияние модернизационных процессов на развитие деловой активности в Минске в конце XIX – начале XX в.

***Ключевые слова:*** предпринимательство; Беларусь; промышленность; торговля; кредит; модернизация; Российская империя.

# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ДЗЕЛАВОЙ АКТЫЎНАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. (НА ПРЫКЛАДЗЕ г. МІНСКА)

***А. В. БУРАЧОНАК***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

На аснове матэрыялаў справаводства, статыстычных і заканадаўчых крыніц Расійскай імперыі даследуецца развіццё асноўных напрамкаў прадпрымальніцкай дзейнасці ў Мінску ў канцы XIX – пачатку XX ст. У дынаміцы паказаны колькасныя і якасныя змены, што адбыліся ў галінах прамысловасці і гандлю. Адлюстраваны стан крэдытнай справы. Выяўлены інстытуцыянальныя змены ў эканамічным жыцці Мінска ў парэформенны перыяд. У высновах паказаны ўплыў мадэрнізацыйных працэсаў на развіццё дзелавой актыўнасці ў Мінску ў канцы XIX – пачатку XX ст.

***Ключавыя словы:*** прадпрымальніцтва; Беларусь; прамысловасць; гандаль; крэдыт; мадэрнізацыя; Расійская імперыя.

**Образец цитирования:**
Бурачонак АВ. Асноўныя тэндэнцыі развіцця дзелавой актыўнасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (на прыкладзе г. Мінска). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2021; 1:26–35.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-26-35

**For citation:**
Burachonak AV. Major trends in the development of business activity in Belarus in the second half of the 19th – early 20th century (the case of Minsk). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;1:26–35. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-26-35

**Автор:**
***Александр Вячеславович Бурачонок*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета.

**Author:**
***Aliaksandr V. Burachonak***, PhD (history), docent; associate professor at the department of modern and contemporary history of Belarus, faculty of history.
*burumag@gmail.com*

# MAJOR TRENDS IN THE DEVELOPMENT OF BUSINESS ACTIVITY IN BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE 19th – EARLY 20th CENTURY (THE CASE OF MINSK)

***A. V. BURACHONAK***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article provides analysis of major directions of entrepreneurship development in Minsk in late 19th – early 20th century, showcases dynamics of quantitative and qualitative changes in industry and trade. The paper uncovers level of credit business development as well as institutional changes in the economic life of Minsk in the post-reform period. The conclusions reveal influence of modernisation processes on the development of business activity in Minsk in the late 19th – early 20th century.

***Keywords:*** entrepreneurship; Belarus; industry; trade; credit; modernisation; Russian Empire.

Падпісанне 19 лютага 1861 г. Маніфеста аб адмене прыгоннага права не толькі надало асабістую свабоду большасці насельніцтва, што пражывала ў Расійскай імперыі, але і стала адпраўным пунктам у працэсе лібералізацыі шматлікіх аспектаў жыцця тагачаснага грамадства. Акрамя трансфармацыі сістэм судаўладкавання і судаводства, мясцовага кіравання і самакіравання, вайсковай справы і іншых сфер грамадскага жыцця, істотныя змены адбыліся і ў рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці. Апошняму садзейнічала прыняцце 1 студзеня 1863 г. Палажэння аб пошлінах за права гандлю і іншых промыслаў і ўдакладненне яго асобных артыкулаў 9 лютага 1865 г. Дадзены заканадаўчы акт можна паставіць у шэраг з другімі[1], якія паклалі пачатак парэформеннаму перыяду ў айчыннай гісторыі новага часу, паколькі зрабілі занятак прадпрымальніцтвам даступным для ўсіх грамадзян незалежна ад падданства, прыналежнасці да пэўнага саслоўя ці полу[2]. Гэта дало штуршок для актывізацыі дзелавой актыўнасці насельніцтва і трансфармацыі эканамічных адносін як у Расійскай імперыі ў цэлым, так і ў беларускіх губернях у прыватнасці.

Змены, якія адбываліся ў эканамічным жыцці Беларусі на працягу парэформеннага перыяду, прывялі да таго, што ў якасці цэнтраў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці яшчэ большую ролю сталі адыгрываць гарады і мястэчкі. Нарастанне дзелавой актыўнасці насельніцтва ў гарадской мясцовасці было непасрэдна звязана з мадэрнізацыйнымі працэсамі, якія разгортваліся ў Расійскай імперыі ў той час. Паляпшэнне транспартнай інфраструктуры, у тым ліку праходжанне праз шэраг населеных пунктаў чыгункі, а таксама тэхнічнае пераўзбраенне прамысловасці дазволілі сканцэнтраваць у беларускіх гарадах і мястэчках вытворчасць фабрычна-заводскай прадукцыі [1, с. 32]. Павелічэнне прамысловага патэнцыялу населеных пунктаў гарадскога тыпу стварала дадатковыя працоўныя месцы, што прыцягвала сюды новых жыхароў. Урбанізацыйныя працэсы, у сваю чаргу, прыводзілі да павелічэння попыту на разнастайную прадукцыю. Гэта выклікала неабходнасць арганізаваць гандлёвыя адносіны ў гарадах і мястэчках па-іншаму. Канцэнтрацыя гандлёвага і прамысловага прадпрымальніцтва ў гарадской мясцовасці Беларусі прыцягвала сюды расійскія і замежныя інвестыцыі. У выніку змяняліся формы і ўмовы ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, узнікалі новыя сродкі вытворчасці і рыначныя інстытуты, якія не замянялі старыя, а дапаўнялі іх. Усё гэта прыводзіла да павелічэння аб'ёмаў вытворчасці, уключэння ў сістэму агульнарасійскага рынку і, як вынік, росту гандлёвага тавараз вароту [2, с. 113]. Такія тэндэнцыі былі агульнымі для ўсёй тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Развіццё дзелавой актыўнасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. неаднаразова разглядалася прадстаўнікамі нацыянальнай гістарыяграфіі. Асобныя аспекты гэтай праблемы знайшлі адлюстраванне ў працах М. Ф. Болбаса [3], Л. М. Міхневіча [4], Х. Ю. Бейлькіна [5], А. Г. Каханоўскага [6], Н. І. Палятаевай [7], А. Л. Кіштымава [8], Ю. Л. Грузіцкага [9], К. А. Бруханчык [10] і інш. У іх, як правіла, вывучэнне пытанняў развіцця дзелавой актыўнасці праведзена на агульнабеларускім узроўні. Аднак у асобна ўзятым населеным пункце ўтварэнне дзелавога асяроддзя магло мець свае адметнасці. Мэта дадзенага

[1]Положение о губернских и уездных земских учреждениях от 1 января 1865 г. № 40457 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 39. 1864. Отд-ние 1. СПб., 1867. С. 1–14 ; Положение о введении в действие Судебных уставов 20 ноября 1864 г. от 19 октября 1865 г. № 42587 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 40. 1865. Отд-ние 2. СПб., 1867. С. 74–84 ; Городовое положение от 16 июня 1870 г. № 48498 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 45. 1870. Отд-ние 1. СПб., 1874. С. 821–839.

[2]Положение о пошлинах за право торговли и других промыслов от 9 февраля 1865 г. № 41779 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 40. 1865. Отд-ние 1. СПб., 1867. С. 160–161.

артыкула – прасачыць, якім чынам праяўляліся тэндэнцыі развіцця дзелавой актыўнасці ў Мінску ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць задачу, звязаную з выяўленнем колькасных і якасных змен у прамыслова-гандлёвым развіцці Мінска ў адзначаны час пад уздзеяннем фактараў рознага характару, якія мелі месца на тэрыторыі Беларусі пасля скасавання прыгоннага права. Сярод спецыялізаваных даследаванняў, прысвечаных эканамічнаму развіццю Мінска ў парэформенны перыяд, вылучаюцца працы З. В. Шыбекі [11; 12]. Але нават у гэтых фундаментальных выданнях, якія комплексна адлюстроўваюць разнастайныя бакі дарэвалюцыйнага жыцця сучаснай сталіцы Беларусі, прыведзены не ўсе аспекты фарміравання тут дзелавога асяроддзя. Пры напісанні артыкула аўтарам былі выкарыстаны заканадаўчыя крыніцы, матэрыялы справаводства і статыстычныя выданні Расійскай імперыі. Ацэньваючы ступень рэпрэзентатыўнасці апошняй групы крыніц, неабходна звярнуць увагу на тое, што не ўсе яны ўтрымліваюць звесткі аб прамысловым і гандлёвым развіцці Мінска. У сувязі з гэтым дынаміка змен паказана па перыядах, не заўсёды кратных пэўнаму ліку, напрыклад 5 ці 10 гадам. Метадалагічны фундамент дадзенага даследавання склала сукупнасць агульнанавуковых, спецыяльна-гістарычных (гістарычна-тыпалагічны, параўнальна-гістарычны і гістарычна-сістэмны), колькасных метадаў з прыцягненнем міждысцыплінарных метадаў навуковага даследавання.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. істотнае значэнне ў фарміраванні дзелавога асяроддзя на тэрыторыі Беларусі адыгралі фактары сацыяльна-эканамічнага характару. Станоўча на развіццё прамысловага прадпрымальніцтва ў беларускіх губернях уплывала мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры. У 1862 г. праз тэрыторыю Беларусі прайшла чыгуначная лінія Парэчча – Гродна, якая з’яўлялася часткай Пецярбургска-Варшаўскай магістралі. За 1867–1913 гг. даўжыня чыгуначных ліній у беларускіх губернях павялічылася з 241 да 3863 км, гэта значыць больш чым у 16 разоў [13, с. 5, 13].

Пры вывучэнні штогадовых справаздач губернатара і падатковага інспектара Мінскай губерні неаднаразова сустракаецца інфармацыя[3], што перакрыжаванне ў Мінску Лібава-Роменскай і Маскоўска-Брэсцкай чыгуначных магістралей дазволіла губерні ўзняцца на якасна новы ўзровень развіцця. Першая з названых ліній давала магчымасць для транспарціроўкі тавараў на прасторы ад паўднёвых губерняў Расійскай імперыі да партоў Балтыйскага мора, другая злучала Маскву з Варшавай, праз якую адкрываўся шлях у краіны замежжа. Наяўнасць зручнага чыгуначнага транспарту дазваляла не толькі збываць выробленую прадукцыю ў розных напрамках, але і засноўваць прадпрыемствы ў аддаленасці ад крыніц сыравіны.

Да з’яўлення ў ім чыгункі горад у плане развіцця прамысловасці быў дастаткова адметным на фоне ўсёй губерні па колькасці прадпрыемстваў, але не сумарнага аб’ёму іх вытворчасці. У 1865 г. у Мінску функцыянавалі 58 прадпрыемстваў, на якіх было выраблена фабрычнай і заводскай прадукцыі на суму 54 780 руб. Усяго ж у Мінскай губерні ў гэты год налічвалася 200 прадпрыемстваў, аб’ём вытворчасці якіх склаў 737 242 руб.[4] Амаль за 15 гадоў колькасць прамысловых устаноў, якія дзейнічалі ў Мінску, скарацілася. У 1879 г. тут налічвалася 46 фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў (7 % ад агульнай колькасці ў губерні), на якіх было выраблена прадукцыі на суму 295 536 руб. (4 % ад агульнагубернскай вытворчасці)[5]. Пры гэтым толькі 3 прадпрыемствы з 46 з’яўляліся гільдзейскімі[6], што сведчыць аб перавазе дробнатаварнай вытворчасці ў Мінску ў гэты час. Да 1890 г. агульная колькасць у Мінску прамысловых устаноў, на якіх выраблялася фабрычная і заводская прадукцыя, зменшылася да 43 (да 6,5 % ад агульнай колькасці ў губерні). Адначасова з гэтым назіралася амаль двухразовае павелічэнне аб’ёму іх вытворчасці – да 589 459 руб.[7], што складала 5,8 % ад сумарнага губернскага кошту вырабленай прадукцыі. За гэта дзесяцігоддзе вырасла колькасць і гільдзейскіх прамысловых устаноў. У 1890 г. у Мінску функцыянавалі 9 такіх прадпрыемстваў з агульным аб’ёмам вытворчасці 354 тыс. руб.[8]

---

[3]Обзор Минской губернии за 1875 год. Минск, 1876. С. 56–57 ; Обзор Минской губернии за 1881 год. Минск, 1882. С. 9 ; Обзор Минской губернии за 1883 год. Минск, 1884. С. 5 ; Нац. гіст. арх. Беларусі (НГАБ). Ф. 358. Воп. 1. Спр. 34. Арк. 51–52.

[4]НГАБ. Ф. 21. Воп. 1. Спр. 14. Арк. 44–44 адв.

[5]Приложение ко всеподданнейшему отчету за 1879 год минского губернатора. Ведомость о фабриках и заводах в Минской губернии за 1879 год. Минск : Губ. тип., [18– –?].

[6]Указатель фабрик и заводов Европейской России с Царством Польским и Великим княжеством Финляндским : материалы для фабрично-завод. стат. / под ред. П. А. Орлова. СПб., 1881. С. 184, 564. Неабходна адзначыць, што ў адпаведнасці з Палажэннем аб пошлінах за права гандлю і іншых промыслаў ад 9 лютага 1865 г. да ліку гільдзейскіх адносіліся прамысловыя прадпрыемствы з механічным рухавіком або немеханізаваныя прадпрыемствы, на якіх налічвалася 16 і больш працоўных. Для арганізацыі вытворчасці на іх неабходна было штогод набываць адпаведнае гільдзейскае пасведчанне.

[7]Обзор Минской губернии за 1890 год. Приложение к всеподданнейшему отчету минского губернатора. Ведомость о фабриках и заводах в Минской губернии за 1890 год. Минск, 1891.

[8]Указатель фабрик и заводов Европейской России : материалы для фабрично-завод. стат. / под ред. П. А. Орлова, С. Г. Будагова. СПб., 1894. С. 244, 337, 379, 669, 707, 718.

У наступныя дзесяцігоддзі адбывалася паступовае павелічэнне колькасці прамысловых прадпрыемстваў, якія працавалі ў Мінску. У 1900 г. іх ужо налічвалася 50, у 1910 г. – 61, у 1913 г. – 69. Пры гэтым уражвае павелічэнне аб’ёму вытворчасці, якое назіралася ў названыя гады. У 1900 г. на прадпрыемствах Мінска было выраблена прадукцыі на суму 2,36 млн руб., у 1910 г. – 3,26, у 1913 г. – 4,37 млн руб.[9] Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў горадзе было сканцэнтравана больш за 13 % ад усіх прадпрыемстваў губерні, іх вытворчасць у грашовым выражэнні складала амаль 12 % ад агульнагубернскай.

Развіццё прамысловага прадпрымальніцтва на тэрыторыі Беларусі ў парэформенны перыяд суправаджалася паглыбленнем спецыялізацыі вытворчасці. У канцы XIX – пачатку XX ст. прамысловыя ўстановы Мінска ў асноўным займаліся перапрацоўкай сельскагаспадарчай, мінеральнай і лясной сыравіны. З цягам часу назіралася пашырэнне іх спецыялізацыі. Калі ў пачатку 1880-х гг. прадпрыемствы па вырабу фабрычнай і заводскай прадукцыі спецыялізаваліся ў 10 сферах вытворчасці, то напярэдадні Першай сусветнай вайны праца ажыццяўлялася ў 32 напрамках прамысловай дзейнасці. Акрамя традыцыйных для беларускага рэгіёна вінакурнай, піваварнай, тытунёвай, гарбарнай, цаглянай, лесаапрацоўчай і іншых галін прамысловасці, у 1913 г. у Мінску функцыянавалі чатыры машынабудаўнічыя прадпрыемствы[10]. Першы такі завод быў заснаваны ў 1881 г. на Скобелеўскай плошчы купцом Н. Якабсонам[11]. На момант стварэння дадзенага прадпрыемства ў межах сучаснай тэрыторыі Беларусі не існавала ніводнага машынабудаўнічага завода. Абсталяванне для галоўных падаткафарміруючых галін беларускай прамысловасці – вінакурнай і лесаапрацоўчай – прадпрымальнікі вымушаны былі набываць у цэнтральных губернях Расійскай імперыі і ў Царстве Польскім[12]. Мясцовых прамыслоўцаў не заўсёды задавальняў кошт прадукцыі маскоўскіх, варшаўскіх і кіеўскіх вытворцаў тэхнікі, а таксама якасць саміх машын. З’яўленне ў цэнтры беларускага рэгіёна машынабудаўнічага завода было ў інтарэсах не толькі прадстаўнікоў мясцовага дзелавога свету, але і дзяржаўных органаў, якія клапаціліся аб сталым паступленні падатковых адлічэнняў у дзяржаўную казну. Таму нядзіўна, што Н. Якабсон з’яўляўся адным з атрымальнікаў крэдыту ў Мінскім аддзяленні Дзяржаўнага банка[13], дзе пазыка выдавалася толькі ўплывовым прадпрымальнікам.

Менш чым за дзесяцігоддзе на базе невялікага прадпрыемства на Скобелеўскай плошчы з’явіўся сучасны завод з паравым рухавіком, на якім працавала 50 рабочых і ў год выраблялася прадукцыі на суму 34 тыс. руб.[14] Да 1896 г. Н. Якабсон меў манапольнае становішча ў машынабудаўнічай галіне прамысловасці не толькі ў Мінску, але і ў межах сучаснай Беларусі. Прадукцыя гэтага прадпрыемства была запатрабавана ў Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Смаленскай і Чарнігаўскай губернях[15]. Аднак у канцы XIX ст. братамі Ліўшыцамі быў заснаваны Вакзальны машынабудаўнічы і медна-жалезакацельны завод. У 1900 г., пасля смерці Н. Якабсона, два машынабудаўнічыя прадпрыемствы аб’ядналі свае вытворчыя магутнасці, заснаваўшы гандлёвы дом «Таварыства Н. Я. Якабсон, Г. Л. Ліўшыц і К$^{o}$». Статутны капітал дадзенага таварыства склаў 120 тыс. руб., а агульны аб’ём вытворчасці на момант аб’яднання – 165,6 тыс. руб. Гандлёвы дом ажыццяўляў featured рознабаковую дзейнасць. Прадпрыемства спецыялізавалася на ўладкаванні вінакурных, лесапільных, шкляных і іншых фабрык і заводаў пры дапамозе ўласнага тэхнічнага бюро, якое займалася складаннем праектаў, чарцяжоў і каштарысаў. Тэхнічная аснашчанасць двух заводаў дазваляла займацца чыгуна- і медна-ліцейнай вытворчасцю, выконваць замовы на выраб рознага кшталту машын і абсталявання для апрацоўкі сельскагаспадарчай і лясной сыравіны[16]. Далейшая сумесная дзейнасць двух мінскіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў дазволіла нарасціць гадавы абарот фірмы да 315 тыс. руб.[17]

Гандлёвы дом «Таварыства Н. Я. Якабсон, Г. Л. Ліўшыц і К$^{o}$» з’яўляецца яскравым прыкладам працэсу асацыіравання капіталу, які назіраўся

---

[9]Обзор Минской губернии за 1900 год. Ведомость о фабриках и заводах в Минской губернии за 1900 год. Минск, 1901 ; Обзор Минской губернии за 1910 год. Ведомость о фабриках и заводах в Минской губернии за 1910 год. Минск, 1911 ; Обзор Минской губернии за 1913 год. Ведомость о фабриках и заводах в Минской губернии за 1913 год. Минск, 1914.

[10]Обзор Минской губернии за 1881 год. Ведомость о фабриках и заводах в Минской губернии за 1881 год. Минск, 1892 ; Обзор Минской губернии за 1913 год. Ведомость о фабриках и заводах в Минской губернии за 1913 год. Минск, 1914.

[11]Указатель фабрик и заводов Европейской России : материалы для фабрично-завод. стат. СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1894. С. 379.

[12]Указатель фабрик и заводов Европейской России с Царством Польским и Великим княжеством Финляндским : материалы для фабрично-завод. стат. / под ред. П. А. Орлова. СПб., 1881. С. 357–372.

[13]НГАБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 34.

[14]Указатель фабрик и заводов Европейской России : материалы для фабрично-завод. стат. СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1894. С. 379.

[15]НГАБ. Ф. 358. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 68.

[16]Список фабрик и заводов Европейской России / под ред. В. Е. Варзара. СПб., 1903. С. 279 ; Указатель действующих в Империи акционерных предприятий и торговых домов / под ред. В. А. Дмитриева-Мамонова : в 2 т. Т. 2. СПб., 1905. С. 132.

[17]Фабрично-заводские предприятия Российской империи (исключая Финляндию) / ред. Ф. А. Шобер. Петроград, 1914. № Б327.

ў дзелавым асяроддзі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. На працягу названага перыяду колькасць гандлёвых дамоў у пяці беларускіх губернях павялічылася з 27 да 443 (у 16,4 раза), акцыянерна-паявых таварыстваў – з 8 да 37 (у 4,6 раза)[18]. У Мінску ў канцы XIX ст. не існавала ніводнага гандлёвага дома, а ў форме акцыянернага таварыства працаваў выключна Мінскі камерцыйны банк[19]. Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў губернскім горадзе дзейнічалі 2 мясцовыя акцыянерна-паявыя таварыствы і 46 гандлёвых дамоў – поўных таварыстваў і таварыстваў на веры[20].

Пачатак XX ст. стаў не толькі часам развіцця асацыіраваных форм прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі, але і распаўсюджвання тут манапалістычных аб'яднанняў. У 1905 г. быў створаны сіндыкат кафляных заводчыкаў у Копысі, у 1906 г. – сіндыкат піваварных заводчыкаў Паўночна-Заходняга краю ў Оршы, у 1911 г. – сіндыкат «Прадакон», куды ўвайшлі гаспадары канвертных фабрык Адэсы, Брэста і Вільні. Акрамя гэтага, уласнікі буйных шкляных заводаў, што працавалі на тэрыторыі Беларусі, удзельнічалі ў з'ездах шклозаводчыкаў Расійскай імперыі, якія ставілі сваёй мэтай усталяваць манапольныя цэны на бутэлькі і рыхтавалі заснаванне сіндыката «Гандлёвае таварыства шкла» [14, с. 23]. Адно з першых манапалістычных аб'яднанняў – Камітэт фабрыкантаў па камісійным продажы запалак (далей – Камітэт) – было створана ў Мінску ў чэрвені 1905 г. Дадзены сіндыкат аб'яднаў фінансавыя магчымасці Мінскага аддзялення Паўночнага банка (з 1906 г. – Мінскага камерцыйнага банка) і вытворчыя магчымасці ўладальнікаў запалкавых фабрык. У склад Камітэта з ліку прадпрымальнікаў пяці беларускіх губерняў увайшлі Б. Саламонаў, якому належалі фабрыкі «Вікторыя» ў Барысаве і «Маланка» ў Мазыры, С. Лур'е, які арандаваў фабрыку «Бярэзіна» ў Нова-Барысаве, І. Гальперын – уладальнік фабрыкі «Прагрэс-Вулкан» у Пінску, браты Лур'е – уладальнікі фабрыкі «Дзвіна» ў Дзвінску, І. Дубінбаум і Х. Штэйнберг – уладальнікі фабрыкі «Край» у Слоніме. Галоўнай мэтай дадзенага манапалістычнага аб'яднання быў збыт запалак на ўнутраным і знешнім рынках Расійскай імперыі дзякуючы сувязям, якія былі наладжаны Паўночным банкам. Банк атрымліваў камісію 5 і 15 кап. за кожныя 1000 пачкаў запалак, якія былі рэалізаваны на ўнутраным і знешнім рынках адпаведна. Гэта была невялікая страта прыбытку для фабрыкантаў, таму што кошт 1000 пачкаў запалак у той час складаў ад 8 руб. 45 кап. да 8 руб. 80 кап. (у залежнасці ад наймення тавару). Разам з тым гэта быў добры даход для банка, паколькі норма продажу ўсталёўвалася ў памеры 664 тыс. скрынак па 1000 пачкаў у кожнай для ўнутранага рынка і 100 тыс. скрынак для знешняга. Дзякуючы стварэнню Камітэта гаспадары запалкавых фабрык змаглі дастаткова паспяхова канкурыраваць на рынку, наладжваючы збыт запалак ва Украіну, на Паўночны Каўказ і ў Закаспійскі край[21].

Чыгуначнае будаўніцтва і развіццё дзелавой актыўнасці ў галіне прамысловасці спрыялі павелічэнню колькасці гарадскога насельніцтва. Мінск гэтыя працэсы не абышлі бокам. Калі ў 1863 г. у горадзе налічвалася 30,1 тыс. жыхароў, то ў 1897 г. іх колькасць павялічылася да 90,9, а ў 1914 г. – да 117,6 тыс.[22] Аднак пераўтварэнні ў прамысловай сферы аказалі не такі моцны ўплыў на ўрбанізацыйныя працэсы. Большае значэнне тут мела развіццё гандлю.

Закранаючы пытанне развіцця гандлёвых адносін у Мінску ў разглядаемы перыяд, варта адзначыць, што рознічны і аптовы гандаль быў засяроджаны пераважна ў руках прадпрымальнікаў з ліку асоб яўрэйскага паходжання. Такая тэндэнцыя назіралася ў населеных пунктах гарадскога тыпу ва ўсіх беларускіх губернях. Так адбылося ў выніку правядзення палітыкі ўрада Расійскай імперыі ў дачыненні да нацыянальных меншасцей, што выявілася ва ўвядзенні мяжы яўрэйскай аселасці і абмежаванні яўрэяў у праве набыцця зямельнай уласнасці па-за межамі гарадской мясцовасці[23]. Напярэдадні адмены прыгоннага права ў Мінскай губерні з 2946 прадстаўнікоў купецкага саслоўя

[18]*Бурачонак А. В.* Распаўсюджванне асацыіраванага капіталу на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 2. С. 58–59.

[19]Акционерное дело в России. Т. 2. Статистика акционерных предприятий. СПб., 1897. С. 30–31.

[20]Акционерно-паевые предприятия России на 1914 год / под общ. ред. В. В. Лаврова. М., 1914. С. 397, 471 ; Сборник сведений о действующих в России торговых домах (товариществах полных и на вере). Петроград, 1915. С. 3, 7, 10, 13, 14, 71, 87, 90, 96, 124, 128, 129, 174, 215, 216, 225, 227, 229, 240, 312, 320, 356, 388, 390, 391, 404, 405, 432, 444, 446, 451, 453, 478, 484, 505, 545, 585, 631, 639, 650, 688, 699, 709.

[21]НГАБ. Ф. 454. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 10–12 адв. ; Там жа. Спр. 6. Арк. 1–5.

[22]Статистический временник российской империи. Вып. 1. СПб., 1866. С. 109 ; Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. Т. XXII. Минская губерния / Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. СПб., 1904. С. 1 ; Статистический ежегодник России. 1914 г. Петроград, 1915. С. 39.

[23]Указ о предоставлении евреям прав гражданства в Екатеринославском наместничестве и Таврической области от 23 декабря 1791 г. № 17006 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 1 : в 40 т. Т. 23. 1789 – 6 ноября 1796. СПб., 1830. С. 287 ; Положение об устройстве евреев от 9 декабря 1804 г. № 21547 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 1 : в 40 т. Т. 28. 1804–1805. СПб., 1830. С. 732 ; Положение о евреях от 13 апреля 1835 г. № 8054 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 10. 1835. Отд-ние 1. СПб., 1836. С. 309, 312–314.

2627 (89 %) мелі яўрэйскае паходжанне[24]. У наступныя чатыры дзесяцігоддзі суадносіны яўрэяў і іншых этнічных груп насельніцтва ўнутры купецкага саслоўя не асабліва змяніліся. У канцы XIX ст. у Мінскай губерні налічвалася ўсяго 3519 купцоў, з якіх 3027 (86 %) былі яўрэямі [6, с. 314, 318]. Пры гэтым у самім горадзе, паводле ўсеагульнага перапісу насельніцтва, у 1897 г. яўрэямі з'яўляліся 1112 (79 %) з 1412 купцоў[25].

Канцэнтрацыя прадстаўнікоў дадзенай этнічнай групы ў гарадской мясцовасці стала адным з чыннікаў развіцця тут прадпрымальніцтва. Акрамя таго, што яўрэі былі актыўна задзейнічаны ў развозным і разносным гандлі, многія з іх з'яўляліся пасрэднікамі паміж пастаўшчыкамі таварнай, у першую чаргу сельскагаспадарчай, прадукцыі і буйнымі аптовымі купцамі, а таксама ўладальнікамі прамысловых прадпрыемстваў. Сярод тых, хто займаўся пасрэдніцкім гандлем на тэрыторыі Беларусі, можна сустрэць такія катэгорыі, як прасалы і фактары. Прасал, як правіла, займаўся скупкай сельскагаспадарчай сыравіны ў вытворцаў з мэтай далейшага яе перапродажу зацікаўленым асобам. Фактор, па сутнасці, з'яўляўся гандлёвым агентам, або, інакш кажучы, камісіянерам, якому даручалі збыць тавар. Па меры пранікнення капіталістычных адносін у розныя галіны гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі атрымлівае распаўсюджванне яшчэ адна катэгорыя пасрэднікаў – маклеры. Яны сталі абавязковым элементам ажыццяўлення біржавога гандлю пасля яго арганізацыі на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. Толькі маклеры мелі права займацца пасрэдніцкай дзейнасцю пры заключэнні здзелак. Маючы даручэнне або паўнамоцтвы прадаўца, яны зводзілі яго з пакупніком або ад імя прадаўца заключалі з ім здзелкі[26]. Аднак і да з'яўлення біржы маклеры ажыццяўлялі сваю дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, зводзячы тых, хто хацеў прадаць пэўную прадукцыю, і тых, хто быў зацікаўлены ў яе набыцці. У цэлым можна канстатаваць, што яўрэі ў гаспадарчым жыцці беларускіх губерняў па сутнасці выконвалі ролю «трэцяга саслоўя», аб'ядноўваючы гарадскі сектар эканомікі з сельскім [15, с. 371].

Развіццё гандлю ў Мінску адбывалася па класічным для тэрыторыі Беларусі таго часу сцэнарыі. У другой палове XIX ст. суіснавалі дзве асноўныя формы ўнутранага гандлю – перыядычны (кірмашы і базары) і стацыянарны (крамы і лаўкі). Фактычна ў пачатку 1860-х гг. пераважнае значэнне мелі перыядычныя формы ажыццяўлення гандлю. Штогод у Мінскай губерні ў цэлым праводзіліся 58 кірмашоў[27]. Па большай частцы яны мелі выгляд вялікіх базараў, якія таксама перыядычна арганізоўваліся з мэтай забеспячэння гараджан прадуктамі харчавання, вырабамі саматужных промыслаў, а сялян – рамеснымі і мануфактурнымі таварамі, прыладамі працы. У Мінску ў гэты час кожны год з 25 мая па 25 чэрвеня праходзіў Іванаўскі кірмаш[28]. Зыходзячы з працягласці яго правядзення можна канстатаваць, што ён адыгрываў істотную ролю ў гандлёвых адносінах горада. Аднак пасля праходжання праз горад чыгуначных магістралей[29] такога кшталту гандаль тут прыпыняецца.

Тэндэнцыя заняпаду кірмашовага гандлю была характэрная для ўсёй тэрыторыі Беларусі, калі мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры прыводзіла да актыўнага пераходу ад неперыядычных форм гандлю да пастаянных (стацыянарных): шапікаў, лавак, крам і інш. На тэрыторыі Мінска пераважна быў развіты лавачны гандаль. Колькасць стацыянарных гандлёвых кропак на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. няўхільна павялічвалася. Так, у 1872 г. у Мінску налічвалася 434 гандлёвыя ўстановы, у 1886 г. – 878, у 1898 г. – 1336, у 1908 г. – 2139[30]. У пачатку XX ст. дробныя гандлёвыя кропкі размяшчаліся амаль на кожнай мінскай вуліцы, больш буйныя – на Губернатарскай, Захар'еўскай, Нямігскай, Петрапаўлаўскай, Падгорнай вуліцах, на Саборнай плошчы [12, с. 262–270]. Побач з імі функцыянавалі і базары. У той час яны збіраліся па некалькі разоў на тыдзень у чатырох месцах: на Траецкай, Юбілейнай і Камароўскай плошчах, а таксама на Каломенскай вуліцы. Па прыблізных падліках у 1908 г. на іх было рэалізавана тавару на суму звыш 1,85 млн руб.[31]

---

[24]Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Т. 16. Минская губерния. Ч. II. СПб., 1864. С. 289.

[25]Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. Т. XXII. Минская губерния / Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. СПб., 1904. С. 224.

[26]Положение о биржевых маклерах, гоф-маклерах, аукционистах, нотариусах, корабельных маклерах, диспашерах и о биржевом комитете для надзора за благочинием биржевых собраний от 12 января 1831 г. № 4255 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 6. 1831. Отд-ние 1. СПб., 1832. С. 19, 21.

[27]Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Т. 16. Минская губерния. Ч. II. СПб., 1864. С. 289.

[28]Рас. дзярж. гіст. арх. Ф. 1263. Воп. 1. Спр. 2960. Арк. 221.

[29]Памятная книжка Минской губернии 1878 года. Ч. 2. Минск, 1878. С. 8.

[30]Памятная книжка Минской губернии на 1873 год. Ч. 1. Минск, 1873. С. 224 ; НГАБ. Ф. 21. Воп. 1. Спр. 37. Арк. 83 ; Там жа. Спр. 87. Арк. 175 ; Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.) / под ред. В. Н. Перцева. Минск, 1953. С. 143–144.

[31]Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.) / под ред. В. Н. Перцева. Минск, 1953. С. 143–144.

Побач з традыцыйнымі формамі ажыццяўлення гандлю на тэрыторыі Беларусі на мяжы XIX–XX стст. пачалі ўзнікаць і новыя. Ужо адзначалася, што ў гэты час атрымлівае распаўсюджванне асацыіраваны капітал. У 1905 г. у Мінску дзейнічала 15 поўных таварыстваў і таварыстваў на веры, з якіх 7 прыкладалі намаганні ў галіне гандлю[32]. Напярэдадні Першай сусветнай вайны з 46 мінскіх прадпрыемстваў, што абралі для сябе пазначаныя формы асацыіравання капіталу, 28 функцыянавалі ў гандлёвай сферы[33].

Поўныя таварыствы і таварыствы на веры рабілі ўнёсак як у рознічны, так і ў аптовы тавараздварот Беларусі. Аднак арганізацыя аптовага гандлю патрабавала з'яўлення прынцыпова новых для гэтай тэрыторыі рынчачных інстытутаў, якімі сталі біржы, аптовыя склады, гандлёвыя прадстаўніцтвы. Варта адзначыць, што апошнія ў Мінску засноўвалі прадпрымальнікі з іншых мясцовасцей Расійскай імперыі, а таксама замежныя падданыя. Напрыклад, сваё аддзяленне ў губернскім горадзе мела нафтаздабываючая фірма братоў Нобеляў – знакамітых расійскіх прадпрымальнікаў шведскага паходжання. Прысутнічаў у Мінску і французскі капітал у выглядзе каспійска-чарнаморскага нафтапрамысловага і гандлёвага таварыства, адным з галоўных акцыянераў якога з'яўляўся А. Ротшыльд з банкірскага дома «Rothschild Freres». Ім жа ў 1898 г. было заснавана гандлёва-транспартнае таварыства «Мазут»[34], дзякуючы якому адбывалася транспарціроўка нафтапрадуктаў. Мясцовыя прадстаўнікі дзелавога свету, у сваю чаргу, прадавалі вырабленыя тавары праз гандлёвыя прадстаўніцтвы ў іншых гарадах Расійскай імперыі. Так, напрыклад, вядомы мінскі вытворца шпалераў і разнастайных відаў паперы (альбомная, папяросная, абгортачная, афішная і інш.) К. М. Кантаровіч рэалізоўваў сваю прадукцыю ў буйных гарадах імперыі пры дапамозе папяровай фабрыкі Кнопа ў Рызе, паравой турэцка-тытунёвай і махорачнай фабрыкі ў Чаркасах, фабрычнага дэпо разнастайных папяросных, рознакаляровых і іншых папер Л. І. Маргуліса і пад. Асабліва цеснае супрацоўніцтва было з папяровай фабрыкай «Скіна» – адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў у гэтай галіне [16, с. 20].

У агульнай структуры аптовага тавараздвароту губернскага горада Мінска істотнае значэнне мелі лясныя аперацыі. І гэта заканамерна, паколькі Мінская губерня па паказчыку колькасці на тэрыторыі лясных масіваў (амаль 40 %) займала адну з верхніх пазіцый у Расійскай імперыі, набліжаючыся да Архангельскай і Кастрамской губерняў, дзе лясамі было занята 58,5 і 56 % усёй тэрыторыі адпаведна. У пачатку XX ст. у Мінску дзейнічалі 43 гандлёвыя прадпрыемствы, што спецыялізаваліся на лясных аперацыях (14 % ад агульнай колькасці ў губерні), гадавыя абароты якіх перавышалі 2,9 млн руб., а прыбыткі – 222 тыс. руб.[35] Адзінае мінскае гандлёвае прадпрыемства, заснаванае ў вышэйшай форме асацыіравання капіталу, – чарнаморска-балтыйскае акцыянернае таварыства «Ш. Б. Ліўшыц і К°» – спецыялізавалася на гандлі ляснымі матэрыяламі, маючы ў Мінскай губерні зямельны надзел плошчай 3 тыс. дзесяцін[36].

Мінск займаў пачэснае месца ў гандлі лесам як на прасторы Расійскай імперыі, так і за яе межамі. Сведчаннем гэтаму можа служыць той факт, што нягледзячы на паступовы заняпад перыядычных форм ажыццяўлення гандлю калядны лясны кірмаш у Мінску заставаўся месцам заключэння буйных здзелак. Напярэдадні Першай сусветнай вайны абароты на ім дасягалі 20 млн руб. у год. За лесаматэрыяламі сюды прыязджалі буйныя прадпрымальнікі і камісіянеры з паўднёвых губерняў Расійскай імперыі, а таксама з Мемеля, Кёнігсберга і Берліна[37].

Варта адзначыць, што правядзенне з 1909 г. каляднага кірмашу ў Мінску з'яўлялася ініцыятывай біржавога камітэта Мінскай лясной біржы. Узнікненне гэтага прынцыпова новага для тэрыторыі Беларусі рынчачнага інстытута ў пачатку XX ст. было абумоўлена менавіта канцэнтрацыяй у горадзе ляснога гандлю. У лістападзе 1904 г. быў зацверджаны статут, а ў маі 1905 г. адбыўся ўстаноўчы сход таварыства Мінскай лясной біржы, на якім быў абраны біржавы камітэт[38]. Аднак паступова стала відавочным немэтазгоднасць існавання дадзенага рынчачнага інстытута, паколькі на біржавыя сходы ніхто не з'яўляўся, рэгістрацыі цэн не адбывалася, а здзелкі здзяйсняліся па-за межамі біржы. Вузкая спецыялізацыя біржы з цягам часу не стала адпавядаць эканамічным запытам і патрабаванням прадстаўнікоў мясцовых дзелавых колаў. Прадукцыя мясцовых сельскагаспадарчых і прамысловых вытворцаў у пачатку XX ст. была запатрабавана ў Маскоўскім, Варшаўскім, Санкт-

[32]Указатель действующих в Империи акционерных предприятий и торговых домов : в 2 т. Т. 2 / под ред. В. А. Дмитриева-Мамонова. СПб., 1905. С. 130–134.

[33]Сборник сведений о действующих в России торговых домах (товариществах полных и на вере). Петроград, 1915. С. 174, 240, 312, 320, 356, 388, 390, 391, 404, 405, 432, 444, 446, 451, 453, 478, 484, 505, 545, 585, 631, 639, 650, 688, 699, 709.

[34]Указатель действующих в Империи акционерных предприятий и торговых домов : в 2 т. Т. 1 / под ред. В. А. Дмитриева-Мамонова. СПб., 1905. С. 900, 1176, 1624.

[35]НГАБ. Ф. 358. Воп. 1. Спр. 86. Арк. 8, 10.

[36]Акционерно-паевые предприятия России на 1914 год. М. : Лавров, 1914. С. 471.

[37]*Канделаки И.* Роль ярмарок в русской торговле. СПб., 1914. С. 42.

[38]Рас. дзярж. гіст. арх. Ф. 23. Воп. 25. Спр. 135. Арк. 122–124.

Пецярбургскім рэгіёнах, у Паволжы, Сібіры і на Каўказе. А зараблялі на гэтым замежныя камісіянеры і гандлёвыя пасрэднікі[39]. Менавіта таму быў неабходны рынкавы інстытут з больш шырокай спецыялізацыяй, які мог бы даць мінскім прадпрымальнікам інфармацыю адносна цэн і попыту на пэўныя тавары на адпаведных рынках. У сувязі з гэтым у 1912 г. па найвышэйшай згодзе міністра гандлю і прамысловасці і губернскага кіраўніцтва Мінская лясная біржа была пераўтворана ў агульнатаварную па прыкладзе іншых 115 гандлёвых і ўніверсальных бірж, якія існавалі ў той час у Расійскай імперыі[40].

Аднак нягледзячы на высокую прыбытковасць гандлёвых прадпрыемстваў, якія спецыялізаваліся на лясных аперацыях, усё ж не яны займалі вядучае месца ў агульнай структуры тавараабароту Мінска ў 1900 г.[41] Па паказчыку агульнага тавараабароту на першым месцы (6,95 млн руб.) знаходзіўся гандаль мануфактурнымі вырабамі – адзеннем, абуткам, гумавымі вырабамі і пад. На адну прыступку ніжэй (6,12 млн руб.) знаходзіўся так званы змешаны гаспадарчы гандаль. Гэта група гандлёвых аперацый была самай стракатай. Да яе аднесены гандаль каланіяльнымі таварамі, гарбатай, цукрам, запалкамі, тытунём, мэбляй, музычнымі інструментамі і нават трунамі. Да гэтай жа групы прадпрыемстваў належалі дробныя лаўкі, ювелірныя крамы, аптэкі, кандытарскія і пад. Дарэчы, на гэтыя гандлёвыя ўстановы прыходзіліся самыя высокія паказчыкі агульнага прыбытку – 343 тыс. руб. На трэцім месцы па паказчыку агульнага тавараабароту (2,88 млн руб.) знаходзіліся прадпрыемствы, якія ажыццяўлялі гандаль выкапнёвымі прадуктамі. Найбольш моцныя пазіцыі тут займаў гандаль жалезам і разнастайнымі металічнымі вырабамі, посудам, соллю, веласіпедамі, сельскагаспадарчымі машынамі і інш. Гандаль лесам і лесаматэрыяламі па паказчыку аб'ёму тавараабароту знаходзіўся на чацвёртым месцы (амаль 2 млн руб.), гандаль жывёльнай прадукцыяй – на пятым (1,61 млн руб.), гандаль земляробчай прадукцыяй – на шостым (амаль 1,5 млн руб.), піцейныя ўстановы і склады алкагольнай прадукцыі – на сёмым (1,46 млн руб.). Сумарна тавараабарот Мінска ў пачатку ХХ ст. складаў 22,53 млн руб., прыбытак ад гандлёвых аперацый – 947 тыс. руб.[42]

Інфармацыйныя магчымасці статыстычных крыніц не дазваляюць прывесці ў дынаміцы змены тавараабароту і прыбытку гандлёвых прадпрыемстваў. Паспрабуем адлюстраваць гэта на губернскім узроўні. У 1896 г. агульны тавараабарот гандлёвых прадпрыемстваў Мінскай губерні складаў крыху больш за 16 млн руб., гадавы прыбытак – звыш 1,8 млн руб.[43] У першым дзесяцігоддзі ХХ ст. гэтыя паказчыкі дасягнулі 41,7 і 5,3 млн руб. адпаведна[44]. Такім чынам, разгледжаныя фактары станоўча ўплывалі на развіццё дзелавой актыўнасці ў Мінску, што выявілася ў павелічэнні дзейнасці гандлёвых устаноў. Такія ж працэсы былі характэрнымі і ў цэлым для тэрыторыі Беларусі. На працягу 1885–1913 гг. аптовы і рознічны тавараабарот тут павялічыўся з 35,63 млн руб. [7, с. 206] амаль да 242 млн руб. [4, с. 8, 21].

Развіццё дзелавой актыўнасці ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. не ўяўлялася магчымым без крэдытнай падтрымкі прамыслоўцаў і гандляроў. Мінская сетка пазыкова-ашчадных устаноў, якая фарміравалася на працягу парэформеннага перыяду, уяўляла сабой складаную сістэму, кожны ўзровень якой арыентаваўся на пэўную катэгорыю прадпрымальнікаў. Напярэдадні Першай сусветнай вайны Мінск з'яўляўся адным са значных фінансава-крэдытных цэнтраў імперыі, абслугоўваючы галоўным чынам паўднёвыя, заходнія і паўночна-заходнія губерні. Акрамя шматлікіх прыватных дысконцераў, тут працавалі аддзяленні дзяржаўнага, руска-азіяцкага і азоўска-данскога банкаў, тры таварыствы ўзаемнага крэдыту, сем банкірскіх кантор, гарадское крэдытнае таварыства і некалькі пазыкова-ашчадных таварыстваў[45].

Такім чынам, у другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. у межах губернскага горада Мінска праявіліся ўсе тыя ж тэндэнцыі развіцця дзелавой актыўнасці, якія былі характэрнымі для ўсёй тэрыторыі Беларусі ў гэты час. Разглядаемыя працэсы суправа-

[39]НГАБ. Ф. 363. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 1–3.
[40]Там жа. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 6109. Арк. 19.
[41]Варта звярнуць увагу на адну акалічнасць, якая звязана з інфармацыйнымі магчымасцямі крыніцы, з якой ніжэй будуць прыведзены звесткі. Справа ў тым, што ў выданні «Торговля и промышленность Европейской России по районам» дастаткова спецыфічна праведзена тыпалагізацыя асноўных відаў гандлёвай дзейнасці. Так, да некаторых груп аднесены гандаль пэўнай сыравінай і атрыманай у выніку яе перапрацоўкі прамысловай прадукцыяй, а таксама асобныя віды паслуг. Разам з тым даныя аб тавараабароце і прыбытку па рэгіёнах прыводзяцца ў абагульненым выглядзе па сямі вызначаных складальнікам выдання тыпах, у сувязі з чым у нас адсутнічае магчымасць правесці сваю тыпалагізацыю, якая адпавядае сучасным уяўленням аб напрамках гандлёвай дзейнасці.
[42]Торговля и промышленность Европейской России по районам. Вып. XI. Полесская полоса. СПб., [19– –?]. С. 54.
[43]Статистические результаты процентного и раскладочного сборов за 1896, 1897 и 1898 годы по исчислению, классификации и определению оборотов и прибылей торговых и промышленных предприятий, подлежащих сим сборам. СПб., 1900. С. 65.
[44]Торговля и промышленность Европейской России по районам. Вып. XI. Полесская полоса. СПб., [19– –?]. С. 17, 21, 30, 34, 47, 50, 52, 54, 57, 59, 60, 62, 66.
[45]НГАБ. Ф. 363. Воп. 1. Спр. 73. Арк. 5.

джаліся ростам колькасці прамысловых прадпрыемстваў, паглыбленнем іх спецыялізацыі і павелічэннем сумарнага кошту выробленай прадукцыі. Урбанізацыя і паляпшэнне шляхоў зносін прывялі да трансфармацыі інстытуцыянальнай структуры рынку. На змену перыядычным формам ажыццяўлення гандлю (кірмашам і базарам) прыходзілі стацыянарныя (лаўкі і крамы). Атрымалі распаўсюджванне поўныя таварыствы і таварыствы на веры, акцыянерныя кампаніі, біржа, гандлёвыя прадстаўніцтвы і іншыя капіталістычныя формы вядзення гандлёвай дзейнасці, што станоўча адбівалася на павелічэнні аб'ёмаў тавараздвароту. Знаходзячыся на перакрыжаванні прамысловых раёнаў і ў той жа час у аддаленасці ад вядучых гарадоў, напярэдадні Першай сусветнай вайны Мінск уяўляў сабой дастаткова буйны гандлёва-прамысловы і фінансава-крэдытны цэнтр, які прыцягваў інвестыцыі айчынных і замежных эканамічна актыўных суб'ектаў гаспадарання.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Кохановский АГ. На пути становления индустриального общества: модернизационные процессы в Беларуси (60-е гг. XIX – начало XX в.). У: Коршук УК, рэдактар. *Працы гістарычнага факультэта БДУ. Выпуск 3*. Мінск: БДУ; 2008. с. 31–46.

2. Бурачонок АВ. Изменения в предпринимательской деятельности в Беларуси под влиянием модернизационных процессов второй половины XIX – начала XX в. *Исторический журнал: научные исследования*. 2019;2:105–115. DOI: 10.7256/2454-0609.2019.2.23968.

3. Болбас МФ. *Промышленность Белоруссии, 1860–1900*. Минск: Издательство БГУ; 1978. 312 с.

4. Михневич ЛМ. *Торговля Белоруссии (1900–1970 гг.)*. Минск: Наука и техника; 1973. 222 с.

5. Бейлькин ХЮ. *Сельскохозяйственный рынок Белоруссии, 1861–1914 гг.* Минск: Наука и техника; 1989. 288 с.

6. Каханоўскі АГ. *Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)*. Мінск: БДУ; 2013. 335 с.

7. Полетаева НИ. *Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX – начало XX вв.* Минск: Белорусский государственный экономический университет; 2004. 247 с.

8. Киштымов А. Основные тенденции развития торговли Беларуси в условиях модернизации XIX – начала XX века. У: Кіштымаў А, рэдактар. *Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання. Матэрыялы I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 14–16 лістапада 2013 г.; Мінск, Беларусь.* Мінск: Тэхналогія; 2014. с. 35–43.

9. Грузіцкі ЮЛ. Станаўленне капіталістычных банкаў у Беларусі ў XIX ст. *Беларускі гістарычны часопіс*. 2004;1: 13–17.

10. Дроздова ЕА. *Формирование банковской системы Беларуси (1861–1914 гг.)*. Минск: Ковчег; 2007. 162 с.

11. Шыбека ЗВ, Шыбека СФ. *Мінск: старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада.* Мінск: Полымя; 1994. 341 с.

12. Шыбека ЗВ. *Минскъ сто гадоў таму*. Мінск: Беларусь; 2007. 304 с.

13. Бурачонак АВ. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.). У: Коршук УК, рэдактар. *Працы гістарычнага факультэта БДУ. Выпуск 9.* Мінск: БДУ; 2014. с. 3–14.

14. Ковалевский ГТ, редактор. *Экономика Белоруссии в эпоху империализма (1900–1917)*. Минск: Издательство Академии наук БССР; 1963. 424 с.

15. Соболевская ОА. *Повседневная жизнь евреев Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX века*. Гродно: Гродненский государственный университет имени Янки Купалы; 2012. 443 с.

16. Бурачонак АВ. Прамысловыя прадпрымальнікі ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. (на прыкладзе фабрыкі па вытворчасці шпалераў К. М. Кантаровіча). *Веснік БДУ. Серыя 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права*. 2010;3:17–20.

## References

1. Kakhanouski AG. [Towards the formation of an industrial society: modernisation processes in Belarus (60s of the 19th – early 20th century)]. In: Korshuk UK, editor. *Pracy gistarychnaga fakul'tjeta BDU. Vypusk 3* [Proceedings of the faculty of history of the BSU. Issue 3]. Minsk: Belarusian State University; 2008. p. 31–46. Belarusian.

2. Burachonok AV. Changes in entrepreneurial activities in Belarus under the influence of modernisation processes of the second half of 19th – early 20th century. *Istoricheskii zhurnal: nauchnye issledovaniya*. 2019;2:105–115. DOI: 10.7256/2454-0609.2019.2.23968. Russian.

3. Bolbas MF. *Promyshlennost' Belorussii, 1860–1900* [Industry of Belarus, 1860–1900]. Minsk: Izdatel'stvo BGU; 1978. 312 p. Russian.

4. Mikhnevich LM. *Torgovlya Belorussii (1900–1970 gg.)* [Trade of Belarus (1900–1970)]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1973. 222 p. Russian.

5. Beil'kin HYu. *Sel'skokhozyaistvennyi rynok Belorussii, 1861–1914 gg.* [Agricultural market of Belarus, 1861–1914]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1989. 288 p. Russian.

6. Kakhanouski AG. *Sacyjal'naja transfarmacyja belaruskaga gramadstva (1861–1914 gg.)* [Social transformation of the Belarusian society (1861–1914)]. Minsk: Belarusian State University; 2013. 335 p. Belarusian.

7. Poletaeva NI. *Kupechestvo Belarusi: 60-e gg. XIX – nachalo XX vv.* [Merchants of Belarus: 60th years of 19th – the beginning of 20th century]. Minsk: Belarusian State Economic University; 2004. 247 p. Russian.

8. Kishtymov A. [The main tendencies of the development of trade in Belarusin the conditions of modernization in 19th – early 20th century]. In: Kishtymaw A, editor. *Gistoryja gandlju w Belarusi (ad starazhytnaga chasu da kanca XX st.): pra-*

*blemy vyvuchjennja i perspektyvy dasledavannja. Matjeryjaly I Mizhnarodnaj navukova-praktychnaj kanferjencyi; 14–16 listapada 2013 g.; Minsk, Belarus'* [History of trade in Belarus (from ancient times to the end of the 20th century): problems of study and prospects of research. Materials of the 1st International scientific and practical conference; 14–16 November 2013; Minsk, Belarus]. Minsk: Tjehnalogija; 2014. p. 35–43. Russian.

9. Gruzicki JuL. [Formation of capitalist banks in Belarus in the 19th century]. *Belaruski gistarychny chasopis*. 2004;1: 13–17. Belarusian.

10. Drozdova EA. *Formirovanie bankovskoi sistemy Belarusi (1861–1914 gg.)* [Formation of the banking system of Belarus (1861–1914)]. Minsk: Kovcheg; 2007. 162 p. Russian.

11. Shybeka ZV, Shybeka SF. *Minsk: staronki zhyccja darjevaljucyjnaga gorada* [Minsk: pages of the life of a pre-revolutionary city]. Minsk: Polymja; 1994. 341 p. Belarusian.

12. Shybeka ZV. *Minsk sto gadow tamu* [Minsk a hundred years ago]. Minsk: Belarus'; 2007. 304 p. Belarusian.

13. Burachonak AV. [The socio-economic conditions of industrial entrepreneurship development in Belarus in the second half of the 19th – early 20th century]. In: Korshuk UK, editor. *Pracy gistarychnaga fakul'tjeta BDU. Vypusk 9* [Proceedings of the faculty of history of the Belarusian State University. Issue 9]. Minsk: Belarusian State University; 2014. p. 3–14. Belarusian.

14. Kovalevskii GT, editor. *Ekonomika Belorussii v epokhu imperializma (1900–1917)* [Economy of Belarus in the era of imperialism (1900–1917)]. Minsk: Izdatel'stvo Akademii nauk BSSR; 1963. 424 p. Russian.

15. Sobolevskaya OA. *Povsednevnaya zhizn' evreev Belarusi v kontse XVIII – pervoi polovine XIX veka* [Daily life of the Jews of Belarus at the end of the 18th – the first half of the 19th century]. Hrodna: Yanka Kupala State University of Grodno; 2012. 443 p. Russian.

16. Burachonak AV. [Industrial entrepreneurs in the economic life of Belarus at the end of 19th – beginning of 20th century as exemplified by Kantarovich's wallpaper factory]. *Vesnik BDU. Seryja 3. Gistoryja. Filasofija. Psihalogija. Palitalogija. Sacyjalogija. Jekanomika. Prava.* 2010; 3:17–20. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 19.01.2021.*
*Received by editorial board 19.01.2021.*